Сё

ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Актуальна | Інфармацыйная гадзіна | Суразмоўца | Адукацыйная прастора | Выхаванне | Якасць адукацыі | Сацыяльны ракурс | Кул

Тэатратэрапія: комплексная рэабілітацыя для людзей з абмежаваннямі

Шукаю работу

# Баршчэўнік, сумнік і “шалёны агурок”

05.11.2019 12:06 Навука і інавацыі

## *Чужаземным агрэсіўным раслінам пакажуць на выхад*

**У пачатку 2019 года стартаваў трансгранічны праект “Зніжэнне негатыўнага ўздзеяння чужародных інвазійных відаў раслін на экасістэмы і дабрабыт людзей у памежным літоўска-беларускім рэгіёне”. Яго задача — узяць пад кантроль агрэсіўных чужаземцаў (усяго вызначана 20 інвазійных відаў), выпрацаваць методыку барацьбы з імі і стварыць устойлівую сістэму, каб папярэдзіць іх распаўсюджванне ў рэгіёне.**

**Аб першых выніках праекта нам расказаў Алег СОЗІНАЎ, доктар біялагічных навук загадчык кафедры батанікі факультэта біялогіі і экалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы.**



**Супраць прыроднага бедства — разам**

— Укараненне (інвазія) агрэсіўных чужародных відаў з’яўляецца глабальнай экалагічнай і сацыяльна-эканамічнай праблемай у свеце, — тлумачыць Алег Віктаравіч. — Інвазійныя віды выцясняюць мясцовыя віды раслін і жывёл, мяняюць і знішчаюць традыцыйныя экасістэмы, наносяць значны эканамічны ўрон краінам і ўяўляюць небяспеку для здароўя людзей. Прадухіленне біялагічных інвазій і змякчэнне іх наступстваў з’яўляецца абавязкам усіх дзяржаў, якія ў 1992 годзе ў Рыа-дэ-Жанэйра падпісалі Канвенцыю аб біялагічнай разнастайнасці. Аднак усе дзеянні ў гэтай галіне эфектыўныя толькі ў міжнародным супрацоўніцтве, бо інвазійныя віды не прызнаюць дзяржаўных меж.

Згаданы праект рэалізоўваецца беларускімі і літоўскімі грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі ў рамках Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь Еўрапейскага інструмента суседства на 2014—2020 гг. З нашага боку ў праекце ўдзельнічаюць Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, упраўленне сельскай гаспадаркі і харчавання Гродзенскага райвыканкама і Рэспубліканскі ландшафтны заказнік

Пошук

juniorskills | worldskills Belarus

Конкурс “Семейная история” Домой! ЧТОБЫ ВСЕ ДЕТИ ЖИЛИ ДОМА

Папулярныя публікацыі

**Магія керамікі і энергія спорту**
Спалучыць неспалучальнае — такога прынцыпу прытрымліваецца Максім Валер’евіч Калтыгін, педагог Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і...

**Платформа “Знай.бай”: цяпер і ў афлайн-рэжыме, і на беларускай мове**
Усё большая колькасць школ Беларусі далучаецца да спецыяльнай віртуальнай адукацыйнай сістэмы “Знай.бай”, вядомай найперш электроннымі...

**Сучасна, эфектыўна, вынікова**
Дзявяты рэспубліканскі калядны фестываль педагагічнага майстэрства стаў чаканым і традыцыйна маштабным. За пару тыдняў да...

**Знайсці работу сваёй мары**
Паўгода назад у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце быў

Нашы дада

Нашы сябр

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайта nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.
Ok Падрабязней.

мясцовых органаў улады, а таксама грамадскіх арганізацый, якія дзейнічаюць у галіне аховы прыроды, і павысіць іх здольнасці для барацьбы з прыроднымі і тэхнагеннымі бедствамі, такімі як распаўсюджванне інвазійных відаў раслін.



Інвазійныя (лац. invasio — “нашэсце, гвалтоўны захоп”) чужародныя віды раслін нясуць пагрозу для харчовай бяспекі, здароўя чалавека і жывёл, біяразнастайнасці ў цэлым.

**Знайсці і абясшкодзіць**

— Асноўныя работы ў рамках праекта ўключаюць інвентарызацыю агрэсіўных відаў, стварэнне дынамічнай базы даных і карт распаўсюджвання відаў, выбар і апрабацыю методык па рэгуляцыі іх колькасці, — расказаў Алег Созінаў.

Так, на першым этапе праекта ўлетку пачалася татальная інвентарызацыя васьмі найбольш небяспечных інвазійных відаў раслін беларуска-літоўскага памежжа (паўночныя тэрыторыі Гродзенскага і Шчучынскага раёнаў Беларусі, Алітускі і Віленскі паветы Літвы). Пад увагу спецыялістаў трапілі клён амерыканскі, ватачнік сірыйскі, эхінацысціс лопасцевы, баршчэўнік Сасноўскага, баршчэўнік Мантэгацы, бальзамін жалезісты, сумнік канадскі і сумнік гіганцкі.

Плошча беларускай тэрыторыі, ахопленай даследаваннямі, складае 1771 км$^2$ і ўключае ландшафтныя заказнікі “Азёры” і “Котра”. Алег Віктаравіч расказаў, што ў аснову палявых работ пакладзены сеткаваты метад. У прамавугольніках (2,4 км на 3,4 км) праводзяцца натурныя пошукі, дзе на кожную знаходку інвазійнага віду расліны афармляецца спецыяльны бланк (у яго ўключаны даныя пра месца знаходжання, месца вырастання і іншая інфармацыя). Усе бланкі і карты сканіруюцца з наступным размяшчэннем у базе даных. Распрацаваны таксама спецыяльны дадатак да смартфона, які дазваляе картаграфаваць і ўносіць апісанні папуляцый, пры гэтым аўтаматычна фіксуюцца каардынаты месца і захоўваюцца фотавыявы знаходак.



— Важна, што картаграфічная і аналітычная работа ажыццяўляецца на геаінфармацыйнай платформе ArcGIS, — гаворыць Алег Созінаў. — Гэта дазваляе аб’яднаць у адзінае цэлае збор палявых даных праз мабільныя прылады, аналіз на персанальным камп’ютары, публікацыю



**Іван БУСЛАЙ: “Марыць трэба заўсёды”**
Папулярны беларускі спявак Іван Буслай не хавае таго, што яго дзяцінства прайшло ў Бабруйскім дзіцячым доме...

**“Першыя”: стартаваў беларускамоўны конкурс ідэй для школьнікаў**

8 кастрычніка ў краіне стартаваў сацыяльна-адукацыйны праект “Першыя”, удзельнікамі якога могуць стаць вучні 9—11-х класаў. У рамках ініцыятывы школьнікі распрацуюць уласную ідэю, атрымаюць магчымасць палепшыць навыкі публічнага выступлення, наведаюць кансультацыі прафесійных экспертаў.

**Чытаць далей.**

**Інфармацыйная гадзіна**

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА: “Любыя рабочыя месцы павінны прыносіць прыбытак”**
Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 14 лютага ажыццявіў сімвалічны пуск абсталявання лініі па вытворчасці сульфатнай беленай...

**Барацьба з каранавірусам: кіраўнік дзяржавы запатрабаваў прыняцця мер эфектыўных, але не празмерных**
Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў па тэлефоне даклад міністра аховы здароўя Уладзіміра Караніка аб узаемадзеянні...

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА: “Гатовы прадаставіць швейцарскаму бізнесу самыя выгадныя ўмовы для інвесціравання”**
Беларусь гатова прадаставіць швейцарскаму бізнесу самыя выгадныя ўмовы для інвесціравання. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр...

**Праграма чарговага Форуму рэгіёнаў павінна быць насычана цікавымі ідэямі і прапановамі**

БЕЛОРУС ПЕДАГОГ имени Ма
Інтэрнэт-рэ
Президент Республики Беларусь www.president.gov.
Статыстыка
531 270 237

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайта nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.
Ok Падрабязней.

Мой суразмоўца паведаміў, што для падтрымкі палявых работ і наступнага аналізу сітуацыі распрацоўваецца ГІС-праект, у склад якога ўвойдуць усе неабходныя базы даных: месцазнаходжанне чужародных інвазійных відаў раслін, транспартная і энергетычная інфраструктура, населеныя пункты, межы ахоўных прыродных тэрыторый, вадаёмы і вадасцёкі. Усё гэта будзе выкарыстана пры распрацоўцы лічбавай карты, якая забяспечыць органы ўлады і адміністрацыі заказнікаў актуальнай інфармацыяй наконт распаўсюджвання інвазійных відаў раслін.



У рамках праекта створана таксама спецыяльная інтэрнэт-анкета для грамадзян, прызначаная для збору даных аб распаўсюджванні 20 чужародных небяспечных відаў раслін у памежным літоўска-беларускім рэгіёне. Паўдзельнічаць у віртуальным апытанні запрашаюцца ўсе жыхары і госці згаданых тэрыторый. Па спецыяльнай спасылцы *https://arcg.is/0Drb1u* ці праз QR-код можна адкрыць анкету і пазначыць знаходку. Так, валанцёрам прапануўваецца пазначыць дату і час назірання, назваць від знойдзенай інвазійнай расліны (свае здагадкі можна зверыць з выявамі, якія змешчаны ў анкеце), ацаніць колькасць інвазійных раслін, назваць месца назірання (для гэтага ў самой анкеце змешчана зручная карта). Прапануўваецца таксама дабавіць фота знаходкі.

— Дапамога жыхароў дазволіць больш поўна ацаніць узровень інвазіі і распрацаваць эфектыўныя мерапрыемствы па ліквідацыі небяспечных відаў, — заўважыў Алег Созінаў.

**“Дарагія госці, ці не перашкаджаюць вам гаспадары?”**

— Вядома, інвазійныя віды засмечваюць пасевы, зніжаюць ураджайнасць, псуюць сенажаці, — гаворыць Алег Віктаравіч. — Але, на мой погляд як біёлага, яшчэ большая праблема заключаецца ў тым, што чужаземцы, трапляючы ў натуральныя біятопы — нашы лясы і лугі, мяняюць правілы гульні пад сябе. Успомніце казку “Зайчыкава хатка” — яна якраз пра інвазію (папрасілася лісічка пераначаваць, ды і выгнала зайчыка). Бяда ў тым, што мы можам страціць не проста асобныя віды, а цэлыя экасістэмы. І ўжо ёсць прыклады таго, як з прыходам інвазійных відаў знікаюць натуральныя лясныя экасістэмы, а з імі ж увязана ўсё астатняе: жывёлы, птушкі, мікрасвет — сотні і нават тысячы відаў. Так чужародныя расліны мяняюць напрамкі развіцця цэлых прыродных супольнасцей. І калі з імі не змагацца, можна страціць нашу аўтэнтычную прыроду, якая была тут спакон вякоў.



У інтэрнэт-анкеце можна ўбачыць выявы інвазійных раслін. Вось прыгажун баршчэўнік — калі не ведаць і спрабаваць сарваць духмяны парасонік, то можна дорага заплаціць за гэта:

**Перагаворы прэзідэнтаў прайшлі ў канструктыўным і рабочым ключы**
Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў час перагавораў з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у фармаце...

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайта nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.
Ok Падрабязней.

А вось сумнік — прыгожы залацісты меданос. Вельмі жывучы і непатрабавальны, ён змог вырвацца за межы палісаднікаў і цяпер адваёўвае ўсё больш тэрыторый. Вельмі моцны алерген. Адна расліна за сезон прадуцыруе да 100 тысяч насення.

Яшчэ адна агрэсіўная расліна — эхінацысціс лопасцевы (так званы шалёны агурок). Гэта травяністая ліяна, якая, разрастаючыся, узбіраецца на дрэвы і кусты і, нібы дах, закрывае ўсё пад сабой. Натуральна, што без сонечнага святла ўсё ўнізе засыхае.

— Я бачыў цэлыя зараснікі эхінацысцісу і загубленыя ім экасістэмы, — расказвае Алег Віктаравіч. — Змагацца з гэтай раслінай вельмі складана, бо яна часта расце вакол рэчак і каналаў — насенне трапляе ў ваду і разносіцца па вадасцёках. Такія каляводныя расліны нават улічваць няпроста, паспрабуй да іх дабярыся. І касіць цяжка, і гербіцыды прымяняць нельга, бо водаахоўная зона. Зрэшты, у рамках праекта мы набылі дрон і цяпер можам паглядзець, што робіцца ў самых цяжкадаступных месцах. Усе буйныя зараслі эхінацысцісу будуць выяўлены, і мы знойдзем магчымасць да яго падабрацца.

Мой суразмоўца гаворыць, што да кожнай расліны патрэбны індывідуальны падыход. У кожным канкрэтным выпадку трэба вырашаць, што рабіць: скошваць да цвіцення, выкарыстоўваць гербіцыд ці, як, напрыклад, з сумнікам гіганцкім, выкопваць маналіт зямлі разам з магутным карэнішчам, высушваць і спальваць.

— Для кожнага віду і для кожнай тэрыторыі трэба шукаць свой прыдатны спосаб, — тлумачыць Алег Созінаў. — А яшчэ важна як мага больш ведаць пра від: адкуль ён, як паводзіць сябе на радзіме, якія ў яго там натуральныя ворагі, што змянілася для яго на новай радзіме. Напрыклад, на Каўказе баршчэўнік — звычайная, даволі бяскрыўдная расліна, бо там яго распаўсюджванне рэгулюецца натуральным шляхам. А ў нас няма насякомых, якія маглі б паядаць карані, кветкі, насенне баршчэўніку — і нішто не стрымлівае яго буянства.

**Экалагічная асвета**



— Адна з мэт праекта — экалагічная асвета, — гаворыць Алег Віктаравіч. — У нас жа як бывае: паехаў чалавек кудысьці, убачыў прыгожую расліну — і ўжо цягне дадому насенне ці парасткі. Вядома, фітасанітарны кантроль ніхто не адмяняў, але за кожным жа не ўсочыш, таму патрэбна выхоўваць у грамадзян экалагічнае мысленне. Клопат аб роднай прыродзе павінен быць у галовах людзей. Перш чым прывезці ў краіну новы від (і раслін, і жывёл), трэба думаць над тым, якія патэнцыяльныя пагрозы ён нясе. Калісьці нашы дзяды пісалі дысертацыі пра сельскагаспадарчае значэнне баршчэўніку, а сёння краіна траціць мільёны на барацьбу з ім.

Разам з тым у біёлага няма ілюзіі наконт таго, што чужаземцаў можна перамагчы.

— Работа з інвазійнымі відамі — гэта назаўсёды, — кажа Алег Віктаравіч. — Выкараніць іх цалкам немагчыма. Гэта як барацьба са Змеем Гарынычам: адсячэш адну галаву, а замест яе вырасце яшчэ некалькі. У сувязі з пацяпленнем на нас наступае поўдзень — а гэта таксама экспансія новых відаў. Такія законы прыроды. Таму барацьба з чужароднымі інвазійнымі відамі павінна стаць сістэматычнай, нават руціннай працай — як веснавое прыбіранне ў двары ці штотыднёвае прыбіранне ў доме. Не чакаць распараджэнняў і загадаў на гэты конт, а метадычна рабіць сваю справу.

**Не акцыя, а дзейсны інструмент**

Алег Созінаў паведаміў, што ў ходзе рэалізацыі праекта будзе распрацавана сумесная стратэгія з планам дзеянняў па прадухіленні далейшага распаўсюджвання інвазійных раслін. А вынікам работы стане пагадненне аб партнёрстве паміж муніцыпалітэтаміВарэны (Літва) і Гродзенскага раёна, што забяспечыць супрацоўніцтва і пасля завяршэння праекта.

— Мы разлічваем, што работа працягнецца і ў будучыні, — гаворыць Алег Віктаравіч. — Немагчыма дапусціць, каб усё звялося да ўзорнай акцыі: паказальна знішчылі нейкую

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.
Ok Падрабязней.

ныя падыходы да іх вывучэння і кантролю.

— Змагацца з пэўным відам толькі ў сваёй краіне, калі гэтым не займаюцца ў суседняй, не мае сэнсу, — заўважыў Алег Созінаў. — Вецер, транспарт, людзі, птушкі — агентаў пераносу насення мноства. Таму плён прынясуць толькі супольныя намаганні, зладжаная работа па агульнай методыцы з абодвух бакоў. Дарэчы, наколькі я ведаю, гэта першы для Беларусі вопыт, калі разам з суседняй краінай пачалі кантраляваць агрэсіўныя віды. І калі ў нас атрымаецца, гэта можа стаць добрым прыкладам для работы ў іншых рэгіёнах.

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
**Фота з архіва Алега Созінава.**

баршчэўнік | інвазійны від | праек | расліна

Кантакты
Адно акно
Рэкламадаўцам

©2014-2019 Сайт газеты "Настаўніцкая газета"

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайта nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп'ютары.
Ok Падрабязней.